тызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 13.7.1943.

**СІТНІК Яўхім Данілавіч,** н. у 1901, старшыня Скрыгалаўскага сельсавета, член падпольнай арганізацыі і партызан Мазырскага атрада, расстраляны 20.1.1943 у г. Мазыр.

**ТУРБАЛ Дзяніс Нікіфаравіч,** н. у 1923, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 24.9.1943, пахаваны ў в. Раманаўка Мазырскага р-на.

**ТУРЧЫН Аркадзь Якаўлевіч,** н. у 1910, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў у кастрычніку 1943.

**ШАСТАКОЎСКІ Аркадзь Раманавіч,** н. у 1910, партызан, загінуў у 1943 у г. Высоцк Ровенскай вобл.

**ШАЎЦОЎ Барыс Аўрамавіч,** н. у 1908, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў у верасні 1943 на чыгунцы ў Петрыкаўскім р-не Гомельскай вобл.

### ВЁСКА ХАМІЧКІ

**НІКІЦЕНКА Міхаіл Васілевіч,** н. у 1926, партызан 125-й Капаткевіцкай брыгады, загінуў у 1943.

М. І. Сітнік



### ВЁСКА ЧАРАМАШНЯ

**ГАФШТЭЙН Шолам Мееравіч,** н. у 1893, старшыня калгаса, партызан Мазырскага атрада, закатаваны ў 1941 у в. Каменка Мазырскага р-на.

По матэрыялах архіваў Беларусі, Украіны, Малдовы спіс падрыхтаваў

*М. Капач*

## Вызваленне

Восенню 1943 г. войскі Цэнтральнага фронту (у кастрычніку 1943 г. перайменаваны ў Беларускі) выйшлі да Дняпра. Злучэнні 65-й арміі ў выніку паспяхова праведзенай аперацыі фарсіравалі Днепр у раёне Лоева, захапілі шэраг плацдармаў.

26 лістапада пасля ўпартых баёў нашы войскі авалодалі Гомелем, вызвалілі першы абласны цэнтр Беларусі. Набліжаўся час вызвалення Мазыра. Была распрацавана аперацыя, якая ўвайшла ў гісторыю Вялікай Айчыннай вайны як Калінкавіцка-Мазырская.

Задача на правядзенне яе была пастаўлена камандаваннем фронту 2 студзеня 1944 г. (камандуючы — генерал арміі К. К. Ракасоўскі, член Ваеннага савета — генерал-лейтэнант К. Ф. Цялегін, начальнік штаба — генерал-палкоўнік М. С. Малінін). На падрыхтоўку аперацыі адводзілася пяць сутак. Ва ўмовах лясіста-балоцістай мясцовасці і бездарожжа асабліва значэнне набывалі камунікацыі. Гітлераўскае камандаванне прыняло ўсе меры для ўмацавання сваёй групоўкі. Калінкавіцкаму чыгуначнаму і шасэйным вузлам, абласному цэнтру Мазыру яно надавала выключнае значэнне. Абарону трымалі 9 пяхотных і 2 танкавыя дывізіі, 3 дывізіёны штурмавых гармат, кавалерыйскі полк і іншыя часці. Былі пабудаваны даўгачасныя абаронныя збудаванні, дзоты, лініі траншэй, мясцовасць была густа замініравана.

Калінкавіцка-Мазырская аперацыя ажыццяўлялася войскамі дзвюх армій: 65-й (камандуючы — генерал-лейтэнант П. І. Батаў, член Ваеннага савета — генерал-маёр Н. А. Радзецкі, начальнік штаба — генерал-маёр М. В. Бабкоў) і 61-й (камандуючы — генерал-лейтэнант П. А. Бялоў, член Ваеннага савета — генерал-маёр Д. Г. Дуброўскі, начальнік штаба — генерал-маёр А. Д. Пулко-Дзмітрыеў). У склад 65-й арміі быў уключаны 1-шы гвардзейскі Данскі танкавы корпус пад камандаваннем генерал-маёра М. Ф. Панова.

АПЕРАЦЫЯ ВОЙСК 61-й АРМІІ ПА ВЫЗВАЛЕННІ МАЗЫРА




У вызваленні Мазыра асноўную ролю адыграла 61-я армія, якая прайшла вялікі баявы шлях. Сфарміраваная загадам Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ад 2 лістапада 1941 г. як рэзервовая, армія прызначалася для арганізацыі абароннага рубяжа на Волзе. У склад арміі ўвайшло 7 стралковых і 2 кавалерыйскія дывізіі з Прыволжскай і Сярэднеазіяцкай ваенных акруг. Абставіны на фронце патрабавалі ўвядзення ў бой рэзерваў. І ўжо ў снежні 1941 г. армія была кінута ў бой у раёне ст. Павялец. Пад камандаваннем генерал-лейтэнанта П. А. Бялова 61-я армія ўдзельнічала ў Курскай бітве, у фарсіраванні Дняпра, у вызваленні Чарнігава, Брагіна, Хойнік.

У баях за Мазыр у аператыўным падпарадкаванні 61-й арміі знаходзіўся 2-гі гвардзейскі кавалерыйскі корпус, створаны на базе кавалерыйскай групы легендарнага генерала Л. М. Даватара. Асабліва вызначыўся корпус у баях пад Масквой, за што быў удастоены звання гвардзейскага. Пасля гібелі Л. М. Даватара корпусам камандаваў І. А. Пліеў, з 1942 г.— В. В. Крукаў.



М. П. Канстанцінаў



І. Т. Чаленка — камандзір 15-й гвардзейскай кавалерыйскай дывізіі



Н. Р. Белацаркоўскі — камандзір роты знішчальнага батальёна

У баях за вызваленне Мазыршчыны ўдзельнічалі таксама 7-мы гвардзейскі кавалерыйскі (камандуючы — генерал-маёр М. П. Канстанцінаў) і 9-ты гвардзейскі стралковы корпусы — 12-я, 15-я і 16-я, 86-я і 356-я стралковыя дывізіі; 77-я дывізія, 415-я, 55-я стралковыя дывізіі, 5-я і 6-я артылерыйскія дывізіі артылерыйскага корпуса, якім камандаваў генерал-маёр Н. В. Ігнатаў, 5-я гвардзейская мінамётная дывізія. Для інжынернага забеспячэння аперацыі была накіравана інжынерна-сапёрная брыгада генерал-маёра М. Ф. Іофе, некалькі асобных батальёнаў. Актыўны ўдзел у аперацыі прымалі часці 16-й паветранай арміі (генерал-лейтэнант С. І. Рудэнка). Злучэнні войск, якія рыхтаваліся да Калінкавіцка-Мазырскай аперацыі, панеслі вялікія страты на Дняпры і атрымалі папаўненне з мабілізаваных у армію жыхароў Чарнігаўшчыны і першых вызваленых раёнаў Гомельшчыны.

У складзе 61-й арміі на Мазырскім напрамку не было танкавых часцей. Адзіная 68-я танкавая брыгада не была поўнасцю ўкамплектаваная. Яна дзейнічала на Калінкавіцкім напрамку і панесла сур'ёзныя страты.

Аперацыя планавалася так: ударамі левага фланга з поўдня і правага фланга 61-й арміі з раёна Гліниая Слабада (25 км на ўсход ад Калінкавіч) у агульным напрамку на Калінкавічы і Мазыр з адначасовым ахопам раёнаў Калінкавічы — Мазыр з паўднёвага захаду сіламі 2-га і 7-га гвардзейскіх кавалерыйскіх корпусаў разбіць войскі ворага, авалодаць гарадамі Мазыр і Калінкавічы і выйсці на рубеж р. Пціч. У дырэктыве камандуючага фронтам камандуючаму 61-й арміі гаварылася: «...61-й армии с утра 8.1.44 г. перейти в решительное наступление с задачей: а) силами не менее четырех с. д. при поддержке 6-й артиллерийской дивизии прорвать фронт обороны противника»[1].

Дырэктыва прадугледжвала авалодаць горадам Калінкавічы 10.1.44 г., а 11.1.44 г., развіваючы поспех на Мазыр, галоўнымі сіламі выйсці да р. Прыпяць на ўчастку Рудня Гарбавіцкая — Града.

На світанні авіяцыя 16-й паветранай арміі нанесла ўдар па абароне ворага, а ў ходзе наступлення атакавала яго артылерыю, рэзервы, чыгуначныя эшалоны. Нашы войскі прарвалі галоўны рубеж абароны ворага і ў першы дзень прасунуліся на 2—6 км. Найбольшы поспех быў дасягнуты на левым флангу арміі, дзе разам з кавалерыйскімі корпусамі дзейнічала 415-я дывізія. У ноч на 8 студзеня 1321-шы полк гэтай дывізіі пачаў з поўдня абыходзіць Ельск і выйшаў у раён вёскі Рамязы.

[1] Цэнтральны архіў Міністэрства абароны (ЦАМА РФ). Ф. 61-й арміі. Воп. 16 695. Спр. 373.

9 студзеня 415-я дывізія і кавалерысты працягвалі рухацца наперад. Часткі 7-га кавалерыйскага корпуса выйшлі ў раён вёскі Мялешкавічы. Камандзір корпуса генерал М. П. Канстанцінаў прыняў рашэнне разбіць варожыя гарнізоны ў вёсках Раманаўка і Слабада, перарэзаць шлях Мазыр — Скрыгалаў.

З'яўленне нашых кавалерыстаў у гэтым раёне, на захад ад Мазыра, было нечаканым для гітлераўцаў, якія лічылі мясцовасць непраходнай. Але 10 студзеня супраціўленне гітлераўцаў узмацнілася. У раёне Ельск, Санюкі, Кустаўніца, Барбароў вораг кінуў у бой рэзервы. Пехацінцы і кавалерысты адбівалі бясконцыя контратакі.

Камандаванне фронту і арміі палічылі тэмп руху кавалерыстаў нездавальняючым. У баявым распараджэнні камандзіру 7-га корпуса камандуючы арміяй пацвердзіў, што, па разведданых, перад кавалерыстамі ворага няма, яны ўпускаюць спрыяльны момант. Папрок быў несправядлівым. У гэты дзень кавалерысты дасягнулі поспеху. Часці 14-й дывізіі ўварваліся ў вёску Прудок. У рукапашным баі было знішчана звыш 400 гітлераўцаў, захоплена 130 палонных, 11 складаў, знішчана інтэндацкая служба 2-й нямецкай арміі.

Каб ліквідаваць прарыў, нямецкае камандаванне высунула насустрач кавалерыстам 1-ю лыжную брыгаду, якая толькі што прыбыла з Германіі, кавалерыйскі полк «Міттэ», які знаходзіўся ў рэзерве, часці 102-й пяхотнай дывізіі і пяць батальёнаў аховы. Супраціўленне ўзмацнілася, але гвардзейцы працягвалі рухацца наперад. Яны павялі наступленне на вёску Козенкі, але былі атакаваны дзвюма ротамі ворага з 6 танкамі і 8 самаходнымі гарматамі «Фердынанд». Кавалерысты панеслі сур'ёзныя страты. У гэты час гвардзейская кавалерыйская дывізія, авалодаўшы вёскай Раманаўка, выйшла да Слабады і пасля цяжкага бою вызваліла вёску.

Важныя падзеі адбыліся 11 студзеня. 3-я кавалерыйская дывізія (генерал-маёр Ягадзін) нечаканым ударам авалодала вёскай Скрыгалаў, за 30 км на захад ад Мазыра. Страціўшы каля 100 чалавек, рэшткі нямецкага гарнізона адступілі на паўночны бераг Прыпяці і ўзарвалі мост. Адначасова 53-ці кавалерыйскі полк маёра Сысоева, які наступаў на вёску Козенкі, выйшаў да чыгункі. Часці 415-й дывізіі з дапамогай партызан актывізавалі свае дзеянні ў раёне Ельска. Каля 8 гадзін раніцы 1326-ты полк уварваўся ў раённы цэнтр. Пад пагрозай акружэння немцы пачалі адыход у напрамку Мазыра, аказваючы ўпартае супраціўленне на прамежкавых рубяжах. Былі вызвалены вёскі Барбароў, Чырвоная Горка, В. Млынок, Праўцюкі, Кустаўніца, Акулінка, Міхалкі, Міцькі, Пянькі, Тварычаўка, Матрункі і іншыя. Вораг замацаваўся на рубяжы Бабраняты — Булаўкі — Козенкі і контратакаваў нашы войскі.

Перад 55-й дывізіяй была пастаўлена задача: двума палкамі разам з лыжным батальёнам перайсці ў наступленне ў напрамку Града — Малая Лубня, авалодаць населенымі пунктамі Шарэйка і Града, аказаць садзейнічанне 415-й стралковай дывізіі ў разгроме ворага на паўночны ўсход ад Ельска.

Баі набывалі ўсё больш жорсткі характар. У раёне Козенак супраць 53-га кавалерыйскага палка былі кінуты танкі. Агнём ворага знішчаны ўсе 45 гармат. Панёсшы сур'ёзныя страты, полк мусіў адысці, бо аказаўся пад пагрозай акружэння. 54-ты кавалерыйскі полк пакінуў вёску Барыскавічы, вызваленую напярэдадні. На ранейшыя пазіцыі адышла ўся 15-я дывізія. Корпус страціў забітымі каля 550 чалавек.

Разам з кавалерыстамі часці 415-й дывізіі пасля ўпартага бою ў той жа дзень авалодалі вёскамі Бабры і Булаўкі.

12 студзеня пачала актыўныя дзеянні 55-я дывізія. Яе часці авалодалі населенымі пунктамі Ігнатаўка, Фабіянаўка, Шарэйкі, Пеніца (Калінкавіцкі раён), Лубня, выйшлі да шляху



Р. А. Бялоў



М. М. Заіюльеў

Мазыр — Калінкавічы ў раёне вёскі Баравікі, але перарэзаць дарогу не змаглі.

415-я стралковая дывізія заняла рубеж каля вёскі Акулінкі. Камандуючы арміяй загадаў паскорыць наступленне дывізіі на Мазыр, а 55-й дывізіі авалодаць пераправай цераз Прыпяць. 14-я кавалерыйская дывізія палкоўніка Г. П. Коблава вызваліла вёску Загорыны, выйшла на паўднёвы бераг Прыпяці за 10 км на паўночны захад ад Мазыра. Асноўныя шляхі адыходу войск ворага былі перарэзаны, але ён, падцягнуўшы рэзервы, узмацніў супраціўленне. Камандаванне 7-га кавалерыйскага корпуса вырашыла абысці вузлы супраціўлення ворага. 14-я дывізія пачала дзеянні ў напрамку чыгуначнай станцыі Мазыр, 15-я дывізія наступала на Каменку і разам з 415-й стралковай дывізіяй выйшла ў раён вёсак Бібікі і Бабраняты. 16-я дывізія пераправілася цераз Прыпяць каля Касцюковіч і наступала на ст. Клінск.

Найбольшага напружання баі за Мазыр дасягнулі 13 студзеня. Вораг працягваў контратакі. 415-я стралковая дывізія на працягу дня адбівала 9 атак пяхоты і танкаў. У 4.00, сабраўшы рэшткі разбітых часцей, вораг контратакаваў нашы войскі ў раёне вёскі Бабры. У цяжкіх умовах камандзір 3-га батальёна 1321-га стралковага палка капітан Цакурын вывеў асабовы склад з вёскі і замацаваўся на новым рубяжы.

Упартае супраціўленне ворага, складаныя ўмовы надвор'я, вялікія страты замарудзілі тэмпы наступлення нашых войск. Вызначаныя планам тэрміны аперацыі не вытрымліваліся. У сувязі з гэтым камандуючы фронтам загадаў: «Войскам 61-й армии, стремительно преследуя противника ... 13.1.44 г. занять гг. Калинковичи и Мозырь». Камандуючы арміяй аддаў загад камандзіру 9-га стралковага корпуса 13 студзеня вызваліць Калінкавічы і перакінуць адну дывізію ў раён Мазыра. Камандзіру 415-й дывізіі была пастаўлена задача цалкам авалодаць Мазыром да 22.00 13 студзеня, гнаць ворага ў напрамку вёсак Прудок, Майсееўка, хутара Надаткі і да канца дня 15 студзеня пераправіцца цераз Прыпяць у раёне Скрыгалава.

7-мы кавалерыйскі корпус узяў напрамак на поўдзень ад Мазыра. З наступленнем цемры кавалерысты 15-й дывізіі і часці 415-й стралковай дывізіі абышлі ворага ў раёне вёскі Булаўкі і пачалі рухацца да Мазыра. Вораг заўважыў коннікаў прыкладна за 1 км ад горада. У гэты час 1321-шы полк адбіў пяць контратак ворага, перайшоў у наступленне і каля 22.00 авалодаў вёскай Бабры. Апоўдні вучэбная каманда 55-й дывізіі на чале з маёрам Далінскім і рота супрацьтанкавых гармат 128-га асобнага дывізіёна пачалі фарсіраваць Прыпяць у раёне вёскі Навікі.

Часці 415-й стралковай дывізіі, якія вызвалілі Козенкі, Дразды, Булаўкі, Бабры, разам з кавалерыстамі ўвайшлі ў Мазыр у 23.00. За імі горад займалі 1321-шы, затым 1326-ты і 1323-ці стралковыя палкі. Адным з першых уварваўся ў Мазыр батальён капітана Мурашкіна з 1321-га палка. 5-я рота, якой камандаваў малодшы лейтэнант Прыстанішчаў, гераічна адбівала ворага.

На світанку пазіцыі ворага з поўначы атакавалі часці 55-й стралковай дывізіі, якія перапраўляліся цераз Прыпяць. Першымі ўварваліся ў горад байцы малодшага лейтэнанта Бойчанкі.



Ветэраны 15-й гвардзейскай кавалерыйскай дывізіі – удзельнікі вызвалення Мазыршчыны на сустрэчы ў 1994 г. у Мазыры

Да 2.00 14 студзеня асноўная частка горада была вызвалена. Поўнасцю Мазыр вызвалены да 6 гадзін раніцы. У вызваленні Мазыра актыўны ўдзел прымала і Мазырская партызанская брыгада пад камандаваннем А. Л. Жыльскага.

У баявым данясенні камандуючага 61-й арміі паведамлялася: «Войска армии, сломив сопротивление противника, овладели Калинковичами и Мозырем. 415 с. д., сломив сопротивление противника на рубеже Бобренята, Булавки, Бобры, к 7.00 овладели г. Мозырь и к исходу дня вышли в район Загорины, Костюковичи, Мерабель...

В боях за Мозырь нанесены значительные потери преимущественно 86 пехотной дивизии противника, убиты 1500 человек солдат и офицеров. Освобождено 710 кв. километров, занято более 80 населенных пунктов».

У дзень вызвалення ў горадзе налічвалася ўсяго 4700 жыхароў. Змучаныя, галодныя людзі выходзілі з падвалаў, паўразбураных дамоў. У армейскай газеце «Боевой призыв» 17 студзеня ваенны журналіст П. Бляхін апісаў гэтую сустрэчу: «Жители выходят из подвалов и со всех сторон стекаются на площадь. Радостные слезы, крепкие объятья, горячие приветствия... Старики и женщины угощают бойцов чем могут. Люди наперебой зазывают бойцов к себе на квартиры. Ставят самовары и за семейным столом принимают красноармейцев, как родных сыновей».

На плошчы адбыўся мітынг, у якім удзельнічалі жыхары горада, воіны-вызваліцелі, партызаны. Горача віталі яны выступленні камандуючага 61-й арміі генерала П. А. Бялова, першага сакратара Палескага абкама КП(б)Б П. А. Лявіцкага. На мітынгу выступалі ўдзельнікі баёў за горад – воіны Чырвонай Арміі, партызаны, жыхары горада.

У баях за вызваленне Мазыра войскі панеслі вялікія страты. Толькі часці 61-й арміі страцілі каля 5 тысяч байцоў, 12 тысяч былі паранены. Нашы войскі не змаглі стварыць перавагі ў жывой сіле і матэрыяльных сродках на галоўных напрамках. Не хапала боепрыпасаў, гаручага. Аперацыю ўсклад-

няла цяжкапраходная лясіста-балоцістая мясцовасць. Адлігі стварылі сапраўднае бездарожжа. Вораг кінуў супраць наступаючых часцей Чырвонай Арміі значныя рэзервы. Наступленне ішло ўсё марудней. 18 студзеня часці 415-й дывізіі прасунуліся наперад усяго на 600—700 м. 19—20 студзеня яны адолелі яшчэ 200—300 м і вымушаны былі спыніцца. На гэтым завяршылася Калінкавіцка-Мазырская аперацыя. Войскі надоўга занялі лінію Дуброва — Юркі — Капаткевічы — р. Пціч. Асноўныя задачы Калінкавіцка-Мазырскай аперацыі былі выкананы. У выніку яе былі вызвалены Калінкавіцкі, Ельскі, Мазырскі, частка Петрыкаўскага і Тураўскага раёнаў.

*Я. Фарберaў*

**БАІ НА БЛІЖНІХ ПОДСТУПАХ ДА МАЗЫРА**

**З баявога загада камандуючага 61-й арміі № 001:**

...2. Армия 8.1.1944 г. переходит в решительное наступление.

10.1. овладевает Калинковичами.

а) Двумя кав. корпусами наносит удар во фланг и тыл противнику с задачей отрезать отход Мозырской группировки противника в западном и юго-западном направлении, захватить переправы на р. Припять на участке Мозырь, Загорины и перерезать жел. дорогу Калинковичи — Житковичи на участке Оголицкая Рудня, поселок Копцевичи.

Справа 65 армия.

Слева 13 армия.

3. Решил: двумя кавалерийскими корпусами, обходя открытый фланг противника, во взаимодействии с 415 стрелковой дивизией — одним корпусом захватить переправы на р. Припять на участке Мозырь — Загорины; вторым корпусом перерезать ж. д. Калинковичи — Житковичи на участке Оголицкая Рудня.

На остальном фронте армии оборонять занимаемый рубеж в готовности к наступлению.

...9. 2-му гвардейскому кав. корпусу с утра 7.1.1944 рейдировать в общем направлении на Кочище, х. Красный, Острожанка, Петриков, обходя открытый фланг противника, отрезая ему пути отхода на Мозырь.

7-му гвардейскому кавалерийскому корпусу с утра 8.1.1944 главными силами пройти линию ж. д. на участке раз. Богутичи — Шишки, обходя открытый фланг противника в общем направлении вдоль западного берега р. Чертень, овладеть ст. Мозырь, Загорины, обеспечивая правый фланг 2-го гвардейского кавалерийского корпуса и взаимодействуя с 415 стр. дивизией.

Задачи по дням:

К исходу 8.1.44 овладеть районом Мелешковичи, Движки;

9.1.44 выйти в район Прудок, Моисеевка, Слободка, Щекотова;

10.1.44 овладеть переправой на реке Припять. Широко использовать помощь партизан...

11.1.1944 г. 415 с. д. оборонять ранее занятую полосу. Силами не менее одного усиленного стрелкового полка во взаимодействии с 7-м гвардейским корпусом с утра 8.1.44 перейти в наступление на своем левом фланге в общем направлении вдоль жел. дороги в р-не Глинные. Конечная задача — во взаимодействии с 7-м гвардейским кавалерийским корпусом овладеть Мозырь...

**З журнала баявых дзеянняў 61-й арміі:**

10 января 1944 г. — к исходу дня на правом фланге противник оказывает сопротивление с прежнего рубежа, на левом фланге выбит из ряда населенных пунктов и оказывает сопротивление с рубежа Ельск, Красный Пильщик и другие.

Противник в течение дня удерживал занятый рубеж, совершенствовал оборону в инженерном отношении...

...7 гв. кав. корпус, продолжая наступление частями 14 гв. кав. дивизии, к 16.00 вышел в район Прудка, Щекотова; 16-я дивизия прикрывает положение корпуса с северо-запада на фронте Моисеевка, Слободка. (Лист 28).

11 января 1944 г. на правом фланге армии противник оказывает упорное сопротивление — переходит в контратаки.

На левом фланге армии противник выбит из ряда населенных пунктов, в том числе из м. Ельск и к исходу дня оказывает сопротивление из района Кустовница, Санюки, Мазуры, Староселье, Рудня.

55 стр. дивизия занимает прежнее положение. 415 с. д. продолжает наступать своим левым флангом, ударом 1321 стр. полка с северо-запада и 1326-го стр. полка с юга, овладели местечком Ельск.

...12 января 1944 г. противник в центре армии оказывает огневое сопротивление. На остальных участках, прикрываясь арьергардами, с утра 12.1.44 начал отходить в западном и северо-западном направлении. В 21.00 из района Александровка вел разведку боем. Потерял до 30 человек убитыми, отошел в исходное положение.

В течение ночи отмечалось усиленное движение противника в направлении Мозырь. В результате боя противник выбит из населенных пунктов Лубня, Гурины, Бибики, Раевские, Матрунки.

Войска правого крыла, сломив сопротивление противника, заняли 12 населенных пунктов.

Части левого фланга продолжали с боями продвигаться вперед и заняли 35 населенных пунктов.

55 стр. дивизия, преодолевая огневое сопротивление противника, овладела Пеница, Лубня.

425 стр. дивизия, продолжая наступление в течение суток, с боями продвинулась на 18 км и овладела 31 населенным пунктом. Занимает рубеж: Акулинка, 600 метров южнее Бибики, Творичевка.

... Противник продолжает отходить. В течение дня контратаковал наши части силою от роты до батальона с 4—10 танками.

Уничтожено 3 танка, 2 орудия, 5 минометов. Захвачено 9 пленных. Противник ведет бой в полуокружении в районе Калинковичи — Мозырь.

415 стр. дивизия отразила 9 контратак силами роты до батальона пехоты с 4—10 танками, заняла Моложево, Бибики, Раевские, Матрунки, Нагорные, Новики и ведет бой за Бобренята, Булавки, Бобры.

Погода — значительная облачность. Временами снегопад. Температура от 4 до 7 градусов.

...Задача 14 гв. кав. див. во взаимодействии с 1816 самоходно-арт. полком действовать вдоль жел. дороги и в течение 13.1.1944 г. овладеть ст. Мозырь, ж. д. мостом через р. Припять и в ночь на 14.1.44 овладеть шоссейным мостом г. Мозыря.

К 10.20 2-я батарея вышла на исходную позицию для атаки — лес южнее д. Мерабель.

К 18.00 1-я батарея заняла исходную позицию для атаки — кустарник юго-западнее села Прудок.

К 13.15 4-я батарея, приданная 56 гв. кав. полку, заняла исходные позиции для атаки — северная окраина леса юго-западнее д. Загорины.

Атака началась в 14.00 13 января 1944 года. 1 и 2 батареи во взаимодействии с кавалерийскими полками овладели д. Мерабель, перерезали ж. д. Овруч — Калинковичи и в 2.30 14.1.44 овладели ст. Мозырь.

4-я батарея во взаимодействии с 56 гв. кав. полком овладела д. Загорины и приняла участие в боях за город Мозырь.

В результате боя уничтожено: минометных батарей — 3, пушек — 2, пулеметных точек — 41, противотанковых орудий — 5, дзот с прислугой — 2, склад горючего — 1, солдат и офицеров — 300.

Потерь материальной части нет.

Ранен и отправлен в медчасть 14 гв. кав. дивизии мл. сержант Мурашкин.

Батареи выведены из боя в связи с отсутствием горючего.

К исходу дня 14 января полк сосредоточился в д. Мерабель. После взятия г. Мозыря полк получил задачу на марш по маршруту Слобода — Романовка — Казимировка — Турбинка — д. Крушники. (Из донесения командира 1816 самоходного арт. полка.)

**З журнала баявых дзеянняў 415-й стралковай дывізіі:**

К 8.00 11.1.44 г. 1326 СП, сломив сопротивление немцев, овладел районным центром и ж. д. станцией Ельск.

Немцы под угрозой окружения благодаря маневру 1321 стрелкового полка в районе ж. д. ст. Ельск начали отход перед всем фронтом дивизии в общем направлении на город Мозырь. Пытаясь приостановить продвижение наших частей, по пути отхода противник оставил усиленные группы прикрытия, оказывая упорное сопротивление на промежуточных рубежах. Продолжая преследование противника, 1323 полк овладел Барбаров, пос. Передовой, Прогресс, Красная Горка, Новая Нива, В. Млынок, Провтюки, Кустовница, Акулинка, после чего вышел в резерв командира дивизии. 1326 СП овладел д. Ми-



П. І. Машчалкаў



І. Б. Хамякоў — начальнік штаба 1323-га стралковага палка 415-й стралковай дывізіі

халки, Новоселки, М. Митьки, Сабино, Пеньки, Раевские и продолжает преследование отходящего противника.

1321 СП овладел Рудня, Староселье, М. Боковец, Мазуры, Творичевка, Сераши, Матрунки.

Противник в составе двух пехотных полков и приданных арт. минометных батарей закрепляется на подступах к г. Мозырь на рубеже: Бобренята, Булавки, Бобры, Козенки, оказывая сильное огневое сопротивление и неоднократными контратаками пытается приостановить движение наших частей. Завязался упорный бой, длившийся более суток, в результате которого сопротивление немцев было сломлено и к исходу дня 1326 полк овладел Бобренята и Булавки.

1321 полк овладел Бобры, Козенки.

В 23.00 13.1.44 г. 1321 СП на плечах отходящего противника первым ворвался в г. Мозырь, за ним 1326 полк и введенный в бой резервный 1323 СП. Начались уличные бои. В результате их в 2.00 14.1.44 г. полностью был освобожден областной центр Полесской области г. Мозырь.

*ЦАМА РФ. Ф. 61-й армии. Воп. 16 695. Спр. 373.*

Падрыхтаваў да друку
*І. Пілiпчук*

**З журнала баявых дзеянняў 7-га гвардзейскага кавалерыйскага корпуса:**

...В течение 12.1. противник оказывал ожесточенное сопротивление, стремясь не допустить продвижение частей корпуса, одновременно начал эвакуацию г. Мозырь и отход частей Ельского гарнизона. С целью обеспечения переправ через р. Припять противник выдвинул в Загорины и Мерабели сильные гарнизоны из Мозыря.

Части корпуса, не имея достаточной живой силы, не могли продвигаться вперед, вследствие чего командир корпуса решил: обходя узлы сопротивления в районе Дрозды, Военный городок, Козинки, охватывающим ударом с северо-запада и юга овладеть г. Мозырь.

...К исходу 13.1.44 противник, видя неизбежность поражения, прикрываясь сильными арьергардами с юга, поспешно производил эвакуацию гарнизона г. Мозырь, пользуясь тем, что путь на север и северо-запад был открыт.

В г. Мозырь царила паника, противник взорвал склады в Военном городке и Мозырь и всеми силами стремился удержать за собой переправы, ведя сильный артиллерийский огонь по боевым порядкам частей корпуса.

В 0.30 14.1.44 15 гв. кд двумя полками во взаимодействии с полком 415 сд после короткого, но упорного боя ворвалась на юго-восточную окраину Мозырь и, продолжая развивать наступление, к 3.10 14.1.44 вышла на сев. окраину Мозырь и р. Припять.

14 гв. кд в 2.30 14.1 решительной атакой 54 и 52 кп с запада и юго-запада, имея впереди боевых порядков самоходные пушки с десантами автоматчиков, после 3-х часового боя ворвалась на ст. Мозырь и в д. Лапти, продолжая очищать от противника эти пункты, к 6.00 закрепилась в них.

Одновременно с частями 14 гв. кд 1321 сп 415 сд, овладев военным городком и Бобры, ворвался на юго-зап. окраину Мозырь.

Остатки разбитых частей Мозырского гарнизона противника в беспорядке отошли за р. Припять.

В результате обходного маневра частей 7 гв. кк по трудно проходимой лесисто-болотистой местности через открытый фланг и тыл противника во взаимодействии с частями 415 сд в ночь с 13 на 14.1.44 был освобожден крупный центр Полесской области гор. Мозырь.

В это время части 9 гв. ск овладели г. Калинковичи, отбросив противника за реку Птичь.

**Вынікі баявых дзеянняў 7-га гвардзейскага кавалерыйскага корпуса:**

За период с 5 по 14.1.44 частями 7 гв. кав. корпуса в ходе боев были разгромлены и уничтожены: батальон 459 пп, 3 дивизион кавполка «Митте», 2 мото сап. батальон, 186 пол. батальон, батальон 454 пп, 80 стр. батальон, 244 стр. батальон, ветеринарная рота, 251 пд, 86 мото стрелк. бат., тылы 251 пд. Освобождено от немецких оккупантов 152 населенных пункта, подбито и уничтожено 10 танков и 6 самоходных пушек, уничтожено 1456 солдат и офицеров и взято в плен 176 человек. Уничтожено 180 лошадей и захвачено 274. Захвачено винтовок 300, пулеметов 285, орудий 8, танков 10, автомашин 451, минометов 15. Захвачено складов 6, 162 бочки бензина и уничтожено 2 склада с боеприпасами.

Выводы:

1. В Мозырской операции 7 гв. кк, выполняя одну из основных задач фронтовой операции, решал характерную для крупных кавалерийских соединений задачу действий на открытом фланге и в тылу противника.

2. Действуя на открытом фланге и в тылу Мозырской группировки противника, кавкорпус, несмотря на исключительно тяжелые условия местности, сумел внезапно прикрыть фланг, а затем выйти в тыл противника на рубеж Прудок, Слобода, тем самым вынудить части противника, обороняющего рубежи Барбаров, Ельск, начать поспешный отход, чем способствовал успешному наступлению 415 сд и в целом 61 армии Белорусского фронта.

Для более согласованного и успешного взаимодействия кавкорпуса с частями 415 сд по захвату Ельск, а затем г. Мозырь, необходимо было 415 сд подчинить командиру кавкорпуса, что значительно ускорило бы выполнение общей задачи по захвату г. Мозырь и полного окружения и уничтожения Мозырской группировки врага.

*ЦАМА РФ. Ф. 7-га гв. кав. корпуса. Воп. 264 483 с. Спр. 1. Л. 11—17.*

## СА СПРАВАЗДАЧЫ БЕЛАРУСКАГА ШТАБА ПАРТЫЗАНСКАГА РУХУ АБ УЗАЕМАДЗЕЯННІ ПАРТЫЗАН З ЧАСЦЯМІ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ Ў МАЗЫРСКАЙ АПЕРАЦЫІ

«7.01.44 у раёне вёскі Новая Рудня — зыходнае становішча занялі 2-гі і 7-мы кав. корпусы.

Тав. Аўдзейчука[1] і Жыльскага[2] выклікалі ў штаб арміі (61-й.— **У. Л.**) для ўдакладнення абставін у тыле праціўніка.

У 18.00 8.01.44 2-гі і 7-мы кав. корпусы з праваднікамі-партызанамі выступілі па маршруце:

1. Новая Рудня, Кузьмічы, Кочышчы, Рэмезы, Ст. Высокае, Махнавічы, Мялешкавічы, Раманаўка і Казіміраўка (зыходны пункт).

2. Новая Рудня, Ст. Высокае, Дуброўка, Сініцкае Поле, Буйнавічы, раён Астражанка (зыходны пункт).

Да вечара 9.01.44 войскі, не заўважаныя праціўнікам, дасягнулі зыходнага становішча — раёна Астражанка, Казіміраўка, Раманаўка.

10.01.44 2-гі і 7-мы кав. корпусы сумесна з партызанамі раптоўным ударам авалодалі населенымі пунктамі Астражанка, Скрыгалаў, Белая, Слабада, перарэзаўшы артэрыю

[1] Р. С. Аўдзейчук — начальнік штаба партызанскага злучэння Паўднёва-Прыпяцкай зоны Палескай вобласці.
[2] А. Л. Жыльскі — камандзір Мазырскай партызанскай брыгады імя А. Неўскага Палескай вобласці.

забеспячэння ворага — палепшаную грунтавую дарогу Мазыр — Петрыкаў. Прыціснуўшы праціўніка да ракі Прыпяць і развіваючы наступленне, на другі дзень — 11.01.44 гітлераўцы былі выбіты з населеных пунктаў Мерабеля, Прудок, Загорыны, ст. Мазыр, Замошша, Сімонічы, Горка, Убароцкая Рудня і інш.

Партызанскія атрады дзейнічалі сумесна з часцямі (корпусаў. — **У. Л.**) пад камандаваннем вайсковых камандзіраў.

13.01.44 камандзір 7-га кав. копруса загадаў 1-му партызанскаму атраду Мазырскай брыгады фарсіраваць раку Прыпяць і ўзарваць на рацэ Іпа чыгуначны мост на ўчастку дарогі Калінкавічы — Капцэвічы.

Партызанскі атрад загад камандзіра 7-га кав. корпуса выканаў, мост быў узарваны.

Часці 2-га і 7-га кав. корпусаў разам з партызанамі разграмілі тылы ворага і, развіваючы наступленне з тылу абароны ворага, да 14.01.44 разграмілі Мазырскую групоўку праціўніка, поўнасцю вызвалілі ад акупантаў Ельскі, Лельчыцкі і Мазырскі раёны Палескай вобласці і цэнтр Палескай вобласці гор. Мазыр.

Генерал-лейтэнант тав. Бялоў аб'явіў падзяку партызанам за актыўны ўдзел у баях і за дапамогу часцям Чырвонай Арміі ў разгроме групоўкі ворага і вызваленні раёнаў Палескай вобласці БССР».

*НА РБ. Ф. 3500. Воп. 3. Спр. 119. Л. 290—293.*

Падрыхтаваў да друку
*У. Лемяшонак*

## У абход па лясах і балотах

### З успамінаў А. І. Ласоўскага, былога нам. камандзіра 2-га гвардзейскага кавалерыйскага корпуса

...Противник на подступах к Мозырю и Калинковичам, опираясь на укрепленный в инженерном отношении район, пытался задержать продвижение Красной Армии. Попытка общевойсковых соединений овладеть Мозырем и Калинковичами с ходу не удалась. Тогда К. К. Рокосовский решил по лесам и болотам в 16 километрах южнее Ельска пустить в тыл противника два кавалерийских корпуса — 2-й и 7-й. В конце декабря 1943 г. морозы были небольшие, и болота покрылись тонким льдом, который не выдерживал тяжести даже пешего человека. Противник, конечно, не мог ожидать на этом направлении действий крупных соединений и был уверен в своей безопасности. Но враг одного не учел — способностей советских кавалеристов.

2-й гвардейский кавкорпус уперся в незамерзшее болото, вынужден был остановиться. Подошли и главные силы (3-я и 4-я гв. кавдивизии). Колонны двигались в направлении Ремезы, Особец, Скрыгалов вдоль поймы речки Чертень. Левей колонны шла 17-я гв. кавдивизия в направлении на Буйновичи. Шел мокрый снег.

Авангардный 12-й гв. кавполк вынужден был остановиться. Мы знали командира Аристова Сергея как энергичного человека. И если он уж остановился, значит, двигаться дальше нельзя. Зная, что впереди болото, я взял с собой саперный взвод и на рысях выехал в голову колонны. Аристов доложил: «Болото не замерзло, только слегка присыпано снегом, пеший и то провалится».

Решили прокладывать путь. К работе приступили дружно. В ход были пущены топоры, пилы, шашки. Полушубки были сброшены. Работали в гимнастерках. Впереди действовали три пешеразведывательные группы, удалось установить связь с партизанским отрядом. Партизаны сообщили, что немцы никакого наступления с этого направления не ждут.

Проложив полукилометровую гать через пойму речки Чертень, я сказал Аристову: «Дуй, Сережа, прямо в Скрыгалов. За фланги не беспокойся».

Я в нем не сомневался, он был старым доваторцем, и разъяснений, как действовать, не требовалось. В головной отряд был пущен эскадрон под командой капитана Ткачева. В разведку на Скрыгалов был выслан взвод лейтенанта Кривошеина Константина Акимовича. Это был москвич, стройный, подтянутый, выше среднего роста, с карими, с весе-



А. І. Ласоўскі



Р. П. Коблаў

лой искоркой жизни, глазами. Получив задачу, он спросил Аристова: «Можно ли до подхода головного отряда захватить Скрыгалов?» — «Действуй по обстановке», — ответил Аристов.

Опорные пункты врагов полк обходил, не ввязывался в бои. В лесу наткнулись на хвойный шалаш. Их встретил седой старик. Кривошеин соскочил с коня. Дед понял, что перед ним свои, и глаза его радостно заблестели. «Вы нам, дедушка, дорогу подскажите, как дойти до Скрыгалова скрыто со стороны Припяти». Дед ответил: «Все тропинки мне здесь известны, но словами тут не поможешь. Все равно собъетесь с пути или нарветесь на их охрану. Я лучше вас сам проведу, это вернее».

Дед действительно вывел взвод почти к самому Скрыгалову. Остановились в лощине с кустарником. Кривошеин заметил часового у здания школы (там был штаб).

Сержант Кихтенко притаился за снежным бугром. Одним прыжком оказался возле часового. Зажав ему рот рукавицей, опрокинул на спину. В окна полетели гранаты. В Скрыгалов ворвался эскадрон Ткачева.

## Салют у гонар гвардзейцаў

**Коблаў Рыгор Пятровіч** (н. 28.9. 1898) з 1919 г. — у Чырвонай Арміі. Летам 1920 г. накіраваны на вучобу ў Маскву, быў крамлёўскім курсантам, увайшоў у гісторыю як першы вартавы каля Маўзалея У. І. Леніна. Вучыўся ў Ваеннай акадэміі імя Фрунзе. Скончыў акадэмію Генеральнага штаба. З лістапада 1943 г. — камандзір 14-й гвардзейскай кавалерыйскай дывізіі, якая прымала ўдзел у вызваленні Мазыра і Мазырскага раёна. Ганаровы грамадзянін Мазыра.

Январской ночью 1944 г. в д. Прудок ворвалась 14-я гвардейская дивизия генерал-майора Григория Коблова. Эта полесская деревня тогда часто упоминалась в штабных донесениях по обе стороны фронта. В ней обосновался штаб тыла 3-й гитлеровской армии, там было также много воинских складов противника.

Появление гвардейцев Коблова в тыловом селе было неожиданным. Гарнизон спал. Бесшумно сняв часовых, кавалеристы прорвались к штабу. Гитлеровцы в суматохе метались по селу. Офицеры пытались организовать сопротивление, но их подразделения были быстро смяты. Большинство пушек и танков так и не успели выстрелить. Через час в Прудке снова стало тихо. 2500 пленных, 500 грузовиков, 200 лошадей — трофеи гвардейцев. Но самым главным успехом было уничтожение штаба и захват складов, где хранились трехмесячные запасы стотысячной армии.

Не ослабляя наступательного порыва, дивизия устремилась на Мозырь. Справа следом за ней шли еще две крупные кавалерийские части. Мощная оборонительная линия, возведенная немцами на восточных подступах к городу, потеряла свое значение. А укреплен город был очень сильно. Его прикрывали доты и дзоты, минные поля и проволочные заграждения.

Командующий Белорусским фронтом приказал конникам атаковать Мозырь с тыла. Глухой ночью 7-й гвардейский кавалерийский корпус, впереди которого двигалась дивизия генерала Коблова, прорвал фронт на стыке двух немецких группировок в районе ж. д. станции Словечна и ушел в рейд по вражеским тылам вдоль западного берега речки Чертень. Все произошло очень быстро, гитлеровцы думали, что просто в тыл им заброшена партизанская группа.

Пять суток почти без остановок и отдыха двигались кавалеристы через леса и болота. Валили деревья, по трясине вели лошадей и тащили пушки. Ночью во мгле, днем в густом тумане. Лошади изнемогали от усталости, но люди выдерживали... Генерал Коблов подбадривал бойцов: «Фашисты греются на печке, нос боятся высунуть на улицу, а мы нагрянем как снег на голову».

И вот в середине января радостная весть прозвучала из репродукторов над Красной площадью, по всей стране. А вечером Москва салютовала гвардейцам двадцатью артиллерийскими залпами.

*А. Абрамаў*

## На подступах да Скрыгалава

Перед батальоном была поставлена задача — выбить гитлеровцев из небольшого полесского селения Малая Лешня. Укрепившись в нем, фашисты сдерживали продвижение наших войск на Скрыгалов и далее — на железную дорогу Калинковичи — Брест. Немцы создали здесь мощную систему огня, простреливая каждый метр на подступах к селению. «Это не Лешня, а настоящая чертова клешня», — зло шутили промеж собой бойцы.

Мария Крутихина, уже бывалый связист, хорошо знала свою роль в предстоящем бою. Она не раз участвовала со своим батальоном в атаках и понимала, что первый, кто дает информацию о реальной обстановке и сообщает истинное местонахождение боевых порядков — это связист.

...По цепи передали приказ: «Крутихину к комбату!» Командир батальона был краток: «Нет связи с наблюдательным пунктом». Мария поняла без лишних слов. Поняла по глазам командира — без связи дело худо. Что там в ротах? Как ведет себя противник? Попробуй угадай!

Комбат хотел сказать этой высокой худой девушке, что связь с НП батальон потерял давно. Но, к большому удовлетворению комбата, девушка освободила его от нелегкого разговора...

— Все ясно, товарищ комбат, разрешите выполнять!

Комбат кивнул согласно головой, посмотрел связистке в глаза, будто для того, чтобы запомнить ее. На троих, ушедших навстречу смерти до нее, он как-то не успел посмотреть.

Мария поползла той же дорогой, по которой шли ее три товарища. И как она ни старалась быть незаметной, фашисты, видно, обнаружили. Они пулями вспахивали каждый квадратный метр земли.

Вот и обрыв. Мария обрадовалась, что теперь она выполнит приказ комбата. Остался пустяк — соединить два конца провода, и связь с наблюдательным пунктом будет восстановлена, а значит, батальон получит возможность, как говорится, «видеть» и «слышать»...

Мария начала торопливо соединять концы оборванной линии. Вдруг неподалеку рванул снаряд — и Марию отбросило в сторону. Она подползла снова к проводу. Она торопилась, будто ожидая, что немцы снова пошлют сюда еще снаряд, однако почувствовала: ранена, пальцы ее больше не слушаются. Поняла: соединить линию руками она не сможет.

Полупослушной ладонью она пододвинула конец провода к лицу и взяла его в зубы. Затем, собрав последние силы, поползла к другому концу. Придвинула так же ладонью и его. Чуть передохнула, потом жадно, как бы боясь опоздать, взяла в рот и этот конец провода. И уже теряя сознание, Мария крепко, до металлического хруста сжала зубы.

...Связистку Крутихину, после того, как батальон выполнил свою задачу, выбив фашистов из хутора, нашла санитарка Полина Юницкая. В бессознательном состоянии Мария была доставлена в госпиталь.

...Прошли многие годы. Подруги встретились. Встреча состоялась в родном селе Полины Александровны Юницкой — Крушники на Мозырщине. Можно было бы встретиться на Урале, в Артемовском. Но Мария Афанасьевна сама предложила, несмотря на состояние здоровья, встретиться там, в белорусском селе. Ведь от этого села совсем недалеко хутор Малая Лешня. Тот самый хутор, отбить который у фашистов помогла в январе 1944 года связист, гвардии рядовой, кавалер ордена Отечественной войны I степени Мария Афанасьевна Крутихина.

*П. Коверда*

Сборник «Дочери Урала в солдатском строю».
Свердловск, 1975.

## Выбух на Іпе

**З успамінаў А. Д. Коласа, былога камандзіра 1-га атрада Мазырскай партызанскай брыгады імя Аляксандра Неўскага**

...Ціхая марозная раніца. Над заснежанымі куранямі ўюцца блакітныя дымкі. У «зімовых палацах» яшчэ спяць партызаны, якія ноччу вярнуліся з задання. Астатніх цягнула бліжэй да цяпла. Прымасціўшыся да агню, з атрыманымі нядаўна з Вялікай зямлі газетамі вядзе гутарку з ляснымі салдатамі камісар атрада Аляксандр Ганчар. У гэты час падбег ад'ютант камандзіра брыгады Аляксандра Жыльскага маладзы зграбны хлапец Пятро Гнедзька.

— Таварыш камандзір атрада, вас выклікае камбрыг!

Штаб брыгады знаходзіўся пры нашым першым атрадзе, і я праз хвіліну быў у зямлянцы камбрыга.

— Ідзём у апошні партызанскі бой. Разам з франтавікамі! Вось паслухай прадстаўніка штаба фронту, падпалкоўніка...

Камандзір падвёў нас да карты, разгорнутай на століку з бярозавых бярвенняў. Размова была кароткай, але грунтоўнай. Групе партызан даручалася разам з узводам лейтэнанта Шаўчэнкі падарваць чыгуначны мост на рацэ Іпа, прытоку Прыпяці. Да моста было кіламетраў дзесяць — дванаццаць.

Выйшлі з атрада, прайшлі адвячоркам вёску Слабаду. Хто на конях, а хто пешшу. Наперадзе ўзвод партызан, за імі група вайскоўцаў. Увайшлі ў Майсееўку, маю родную вёску. Вось і зыходны рубеж, на ўскраіне лесу. Да Загорын кіламетры тры, поле адкрытае, злева і справа — узвышшы, дзе, магчыма, прытаіўся вораг.

Раптам у неба ўзляцелі ракеты — адна, другая, трэцяя, і на нас абрушылася лавіна агню. Мы заляглі. Нябачныя кулі ўпіваліся ў снежную гару, падалі з дзікім іржаннем коні. Хтосьці застагнаў...

Відаць, гэтае месца немцы пристралялі яшчэ завідна. Непадалёку разарвалася міна. Другая, трэцяя... Засвісталі над галовамі асколкі.

Мы не стралялі, каб не выдаць сябе, ды і не бачылі, куды страляць.

Ноч светлая, месячная... Калядныя маразы — дванаццатае студзеня. На белай снежнай коўдры выразна чарнеюць чалавечыя постаці, тыя, што павінны ўзарваць мост, і тыя, хто ўжо не ўстане ніколі.

Коні сталі вырывацца з рук і ўцякаць, падмінаючы пад сябе людзей. З'явілася многа параненых. Што рабіць? Палкоўнік сказаў, што наша заданне вельмі важнае для ажыццяўлення ўсёй Мазырскай аперацыі. Сам Ракасоўскі сочыць за яго ходам. А мэта — мост на Іпе.

Разам з Валодзем Лук'яновічам паўзём да лейтэнанта Шаўчэнкі. Ён трапіў пад забітага каня. Дапамаглі выбрацца. Прымаем рашэнне: адыходзіць назад на той узлесак, адкуль бралі кірунак на Загорыны. Прыйшлося да самага лесу паўзці па полі. У лесе развялі вогнішча, сталі перавязваць параненых, адаграваць ногі. Раптам штосьці завыла ўверсе — выбух, трэск галля. Гэта разарвалася варожая міна. Асколкі ад дрэва ўдарылі па твары Уладзіміра Лук'яновіча, палілася кроў. «Нічога не бачу... Няўжо вочы выбіла?»

Выйшаў са строю адважны партызанскі камісар, якому ішоў дваццаць трэці год... Пра яго гаварылі: «Лук'яновіч не ведае, што такое страх».

Раніцай прыехаў да нас той самы палкоўнік. Ён ужо ведаў, што мы не прайшлі. Не крычаў, не лаяўся. Сказаў, што былі звесткі, нібы ні ў Загорынах, ні навокал ворага няма. Аказалася, усё інакш... Трэба ісці на Іпу другім, партызанскім маршрутам. Назад праз Хамічкі.

Падмацаваўшыся ў вёсцы, пагрэўшыся, узялі курс на Прыпяць. За гадзіну былі ў Касцюковічах. «Вёска, а людзей не відаць...» — заўважылі вайскоўцы. «Тут лічаныя душы ў жывых засталіся. Каго параненымі, а ў боль-

шасці жывымі кідалі галаварэзы ў студні», — адказаў камісар атрада Ганчар.

Прайшлі Прыпяць. На лузе — глыбокі снег. Непадалёку і мост. Выслалі ў тым напрамку разведку. Паставілі задачу байцам і партызанам. Кожная група атрымала заданне: хто ідзе да моста, хто прыкрывае агнём.

Падрыўнікі — наперадзе. Злева, ззаду — дазоры. Здаецца, ніхто не дыхаў. Ступалі па глыбокім снезе ціха, асцярожна. Даволі блізка змаглі падысці да моста. Але гітлераўцы не спалі, яны пачалі шалёны абстрэл нашых груп. Асабліва моцны агонь быў злева і справа ад моста. Кляшчоў са сваёй групай папоўз да левага агнявога пункта. Камісар Аляксандр Ганчар узяў на сябе камандаванне другой групай, замяніў параненага Валодзю Лук'яновіча. Шаўчэнка са сваёй групай рухаўся следам за падрыўнікамі.

Агонь — галавы не падняць, а байцы ўпарта паўзуць да моста. Асабліва цяжка падрыўнікам, яны наперадзе.

Праходзіць нейкі час. Змаўкае адзін дзот, затым другі... Групы здолелі скрытна падпаўзці і закідаць іх гранатамі. Неўзабаве падрыўнікі ўжо пад мостам. Прайшло яшчэ некалькі хвілін, і ў перадсвітальнай зімовай імжы прагрымелі выбухі. Мост узляцеў у паветра. Заданне выканана... Над лесам, лугам пранеслася пераможнае партызанскае «ўра!».

Не ўсе вярнуліся з гэтай аперацыі. Вайна ёсць вайна. А насустрач ужо ішлі наступаючыя вайсковыя часці. Яны ўжо ведалі пра нашу баявую ўдачу і віншавалі з перамогай, частавалі хлебам, цыгарэтамі.

Іншыя групы партызан у гэты час разам з коннікамі 16-й кавалерыйскай дывізіі наступалі на Скрыгалаў, Асавец, Мазыр. Сустрэліся мы назаўтра, 14 студзеня 1944 г., на галоўнай плошчы вызваленага Мазыра. У той дзень быў мітынг пераможцаў і нямногіх жыхароў горада, што засталіся ў жывых. Незвычайны мітынг застаўся ў памяці кожнага з нас...

## З ПАЛІТДАНЯСЕННЯ ПАМОЧНІКА НАЧАЛЬНІКА ПАЛІТАДДЗЕЛА ПА РАБОЦЕ СЯРОД КАМСАМОЛЬЦАЎ 61-Й АРМІІ ПАДПАЛКОЎНІКА ЧУЧУЕВА ПАМОЧНІКУ НАЧАЛЬНІКА ПАЛІТУПРАЎЛЕННЯ 1-ГА БЕЛАРУСКАГА ФРОНТУ ПА РАБОЦЕ СЯРОД КАМСАМОЛЬЦАЎ ПАДПАЛКОЎНІКУ НАСАЧОВУ АБ ГЕРОЙСКІХ ПОДЗВІГАХ КАМСАМОЛЬЦАЎ У БАЯХ ЗА МАЗЫР І КАЛІНКАВІЧЫ

...Мужественно и умело дрались за Мозырь комсомольцы соединения, где помощником начальника политотдела по комсомолу капитан т. Глацкий. Перед боем комсомольцы дивизии дали клятву завоевать почетное звание для дивизии, удостоить ее чести называться Мозырской. Свою клятву они с честью выполнили.

1. Первым ворвался в город со своим отделением комсомолец — мл. сержант Светиков. Из автомата он лично уничтожил трех немцев, а бойцы его отделения уничтожили более 20 немцев. Командир полка лично вынес благодарность т. Светикову и представил его к ордену «Красная Звезда».

2. Отличился в этом бою комсомолец-пулеметчик т. Паринов, который уничтожил из пулемета 9 немецких солдат. Впереди его шел комсомолец-сапер т. Ярошенко, который со своим товарищем обезвредил 15 немецких мин и прорезал на 16 метров проволочное заграждение противника, чем обеспечил быстрый проход бойцов непосредственно в город. За умелые действия тт. Паринов и Ярошенко награждены правительственными наградами.

3. Хорошо действовали в бою за г. Мозырь комсомольцы тт. Синько, который гранатой уничтожил немецкий пулемет с прислугой, за что награжден орденом «Красная Звезда», Алафердян, который уничтожил из автомата четырех немцев, Хакимов, комсорг роты... Он первым бросился на немцев и убил штыком двух немцев. В этом бою т. Хакимов пал смертью храбрых. Посмертно награжден орденом Отечественной войны II степени.

...Хорошо действовали в боях за г. Мозырь комсомольцы соединения, где помощником нач-ка политотдела по комсомолу капитан т. Остапенко. За отличие в боях более 50 комсомольцев награждены орденами и медалями СССР. Наиболее яркий подвиг совершил комсо-

молец-пулеметчик т. Хорьков, который в течение 8 дней находился непосредственно в боевых порядках передовых подразделений, из своего пулемета отбил 5 контратак противника, уничтожил более 30 немцев. За свои подвиги т. Хорьков награжден тремя орденами.

Когда наши подразделения ворвались в г. Мозырь, то противник пытался зайти с фланга... В разведку были посланы комсомольцы Пулегов и Елфутин, которые разведали силы противника и привели пять пленных немцев. Комсомольцы награждены орденами Славы III степени.

Помощник начальника политотдела 61-й армии по работе среди комсомольцев подполковник *Чучуев*

*ЦАМА РФ. Ф. 233. Воп. 2374. Спр. 237. Л. 227, 228.*

Падрыхтаваў да друку
*У. Лемяшонак*

## БОИ НА УЛИЦАХ МОЗЫРЯ

Ожесточенный бой за Мозырь разгорелся еще на подступах к городу. Здесь немцы соорудили мощные укрепленные линии долговременного типа. Каждая деревня, каждая высота были превращены в сильные опорные пункты и узлы сопротивления.

Но стремительный удар наших воинов опрокинул все расчеты немцев. Первым в город в ночь на 14 января ворвался батальон капитана Мурашкина.

Немцы не ожидали стремительного удара наших бойцов, стали поспешно отходить, ведя редкий ружейный и автоматный огонь. Внезапность позволила бойцам быстро овладеть крайними домами. Гитлеровцы не успели оказать здесь серьезного сопротивления. Сооруженный ими на окраине бункер — дот был сразу же обойден взводом старшины Попова, и гарнизон этого дота, почуяв окружение, стал разбегаться.

В то время, как штурмовая группа батальона, овладев окраиной, вышла на Ленинскую улицу, на правом фланге из оврагов выступили бойцы роты Федорова. Рассредоточившись в цепь, они немедленно начали очистку города с юго-восточной стороны вдоль реки Припять. Точно так же действовали две другие роты на левом фланге с юго-западной стороны. Действия рот на флангах облегчили продвижение бойцов штурмовой группы, вскоре достигнувшей центра города — площади Свободы.

Здесь немцы попытались оказать сопротивление, главным образом с крыш и чердаков. Но их быстро снимали оттуда наши автоматчики. Особенно в этом отличился старший сержант Цуканов. С крыши одного трехэтажного здания строчил вражеский автоматчик. Цуканов незаметно пробрался двором, быстро влез по приставленной к дому лестнице на крышу и захватил немца в плен.

Около трех часов длилась очистка города от немцев.

Мозырь снова стал советским.

Майор *В. Светцов*

*«Боевой призыв», 15 студзеня 1944 г.*

## ЗАГАД ВЯРХОЎНАГА ГАЛОЎНАКАМАНДУЮЧАГА ГЕНЕРАЛУ АРМІІ РАКАСОЎСКАМУ

Войска Белорусского фронта в результате умелого обходного маневра сегодня, 14 января, штурмом овладели областным центром Белоруссии городом Мозырь и крупным железнодорожным узлом и городом Калинковичи — важными опорными пунктами обороны немцев на полесском направлении.

В боях за овладение городами Мозырь и Калинковичи отличились войска генерал-лейтенанта Батова, генерал-лейтенанта Белова, генерал-лейтенанта Крюкова, генерал-майора Константинова, генерал-майора Иванова И. И., генерал-майора Алексеева, артиллеристы генерал-полковника артиллерии Казакова, генерал-майора артиллерии Бескина, генерал-майора артиллерии Игнатова, генерал-майора артиллерии Егорова, танкисты генерал-майора танковых войск Панова и летчики генерал-лейтенанта авиации Руденко.

В ознаменование одержанной победы соединения и части, наиболее отличившиеся в боях за освобождение городов Мозырь и Калинковичи, представить к присвоению наименований «Мозырских» и «Калинковичских» и к награждению орденами.

Сегодня, 14 января, в 21 час столица нашей Родины Москва от имени Родины салютует нашим доблестным войскам, освободившим города Мозырь и Калинковичи, двадцатью артиллерийскими залпами из двухсот двадцати четырех орудий.

За отличные боевые действия объявляю благодарность всем руководимым Вами войскам, участвовавшим в боях за освобождение городов Мозырь и Калинковичи.

Вечная слава героям, павшим в борьбе за свободу и независимость нашей Родины!

Смерть немецким захватчикам!

Верховный Главнокомандующий Маршал Советского Союза *И. Сталин*

*14 января 1944 года (№ 59)*

## Франтавая песня аб Мазыры

У гады Вялікай Айчыннай вайны кампазітар Анатоль Новікаў і паэт-песеннік Леў Ашанін у гонар вызвалення абласнога цэнтра Мазыра ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў напісалі «Песню пра Мазыр».

Был в руках у немцев козырь,
Стала крепость, что гора.
«Неприступен город Мозырь», —
Говорила немчура.

*Припев:*
У нас орлы-ребята.
Гой! Гой! Гой!
С нами пушки, автоматы.
Гой! Гой! Гой!

Ночью темной и глубокой
Скрылись конники во мглу.
Ждали фрицы нас с востока,
Глядь, а мы у них в тылу.

*Припев.*

Вынимали мы недаром
Искрометные клинки,
Дали, дали фрицам жару
Под деревнею Прудки.

*Припев.*

Снова бит немецкий козырь.
Путь к победе недалек.
Расцветай, советский Мозырь,
Наш полесский городок.

*Припев:*
А у нас орлы-ребята.
Гой! Гой! Гой!
С нами пушки, автоматы.
Гой! Гой! Гой!

## Героі Савецкага Саюза, якія загінулі пры вызваленні Мазыршчыны

**Захараў Канстанцін Фёдаравіч** (н. у 1919 г. у г. Іванава). Лётчык-знішчальнік, камандзір авіяэскадрыллі. Загінуў 13.1.1944 г. Пахаваны ў Мазыры на Кургане Славы.

З першых дзён вайны К. Ф. Захараў на фронце, удзельнічаў у абароне Масквы. Меў не адну перамогу ў паветраных баях, камандаваў эскадрылляй. У сакавіку 1942 г. за баявыя поспехі К. Ф. Захараў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Потым былі бai на Курскай дузе, дзе яго самалёт узнімаўся ў паветра па 7—8 разоў у дзень.

21 ліпеня 1943 г. эскадрылля капітана Захарава вылецела на перахоп варожых бамбардзіроўшчыкаў у раёне Спаскага. Савецкія лётчыкі імкліва атакавалі ворага і збілі пяць самалётаў. За смеласць і знаходлівасць, праяўленыя ў баях на Курскай дузе, К. Ф. Захараву была ўручана яшчэ адна ўзнагарода — ордэн Айчыннай вайны I ст. Ён зрабіў 190 баявых вылетаў, удзельнічаў у 41 паветраным баі, збіў 15 варожых самалётаў. Удзельнічаў у вызваленні Варонежа, Арла, Белгарада, Лоева, Гомеля...

У студзені 1944 г. войскі Беларускага фронту разгарнулі наступленне ў напрамку на Мазыр. Гітлераўцы стварылі ў горадзе і на подступах да яго глыбокаэшаланіраваную сістэму абароны з міннымі палямі, драцянымі загародамі, вялікай колькасцю дотаў, дзотаў і траншэй. Кровапралітныя бai разгарнуліся на зямлі і ў небе.

13 студзеня капітан Захараў вёў у бой з ворагам чацвёрку чырваназорных ЯК-9. Разам з ім ляцелі лейтэнант І. І. Волкаў, малодшыя лейтэнанты Е. В. Тарасенкаў і М. П. Каўказскі. Буйная аўтакалона гітлераўцаў была выяўлена на захад ад Мазыра. Па камандзе Захарава лётчыкі пачалі граміць яе, зніжаючыся да брыючага палёту. Запалалі аўтамашыны. У разгар бою ў Захарава скончыліся боепрыпасы, ён пачаў імітаваць атакі. У час апошняга заходу на цэль самалёт вядучага быў падбіты варожым снарадам і загарэўся. Машына дрэнна слухалася пілота. Да свайго аэрадрома не дасягнуць, а сесці на тэрыторыю,


К. Ф. Захараў


Д. Калдыкараеў


М. М. Катаеў


І. Г. Лапін

занятую ворагам, азначала гібель або яшчэ горш — палон...

«Біце іх, браткі!» — крыкнуў на развітанне камандзір эскадрыллі сваім баявым сябрам, а сам накіраваў ахоплены полымем самалёт на скапленне варожых машын. Аглушальнай сілы выбух скалануў паветра...

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 2 жніўня 1944 г. капітану К. Ф. Захараву пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

На Мазырскім нафтаперапрацоўчым заводзе ён залічаны ў калектыў рамонтна-механічнага цэха завода, у гонар Героя Савецкага Саюза К. Ф. Захарава ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

*А. Ярохін*

**Калдыкараеў Джумагалы** (н. у 1922 г. у Каракалпакіі) — радавы знішчальнага супрацьтанкавага дывізіёна. 27.10.1943 г. пад агнём праціўніка на падручных сродках першым пераправіўся цераз Днепр каля Камарына, захапіў апорны пункт, чым садзейнічаў фарсіраванню ракі свайму падраздзяленню. Захоплены ўчастак байцы ўтрымлівалі да пераправы ўсяго дывізіёна.

Загінуў пры вызваленні Мазыршчыны 26.1.1944 г. Пахаваны ў Мазыры на Кургане Славы.

**Катаеў Міхаіл Максімавіч** (н. 5.12.1903 г. у Паўладарскай вобл.) — старшына, камандзір разліку супрацьтанкавага ружжа. 27.9.1943 г. у ліку першых фарсіраваў Днепр каля в. Ніўкі Брагінскага р-на і агнём з ПТР забяспечыў пераправу 7-га знішчальнага супрацьтанкавага дывізіёна 7-га гвардзейскага кавалерыйскага корпуса.

Загінуў 26.1.1944 г. пры вызваленні Мазыршчыны. Пахаваны ў Мазыры на Кургане Славы. Яго імем названа вуліца.

**Лапін Іван Георгіевіч** (н. 6(19).12. 1916 г. у в. Пешава (цяпер Лапіна) Кастрамской вобл. у сялянскай сям'і). Скончыў 6 класаў, працаваў трактарыстам у калгасе. У Чырвонай Арміі ў 1927—1939 гг. і з 1941 г. Скончыў курсы малодшых лейтэнантаў. На фронце з лютага 1942 г. Камандзір мінамётнай батарэі 56-га гвардзейскага кавалерыйскага палка.

У час наступлення на в. Альшанае агнём яго батарэі было знішчана 7 варожых гармат, 2 мінамёты. 3.10.1943 г. заглушыў агонь 5 варожых батарэй, што забяспечыла паспяховае фарсіраванне нашым войскам р. Брагінка, знішчыў больш як 120 ворагаў. Загінуў 12.1.1944 г. каля в. Прудок пры наступленні нашых войск на Мазыр.

Пахаваны на плошчы Працы ў Гомелі. Яго імя носіць вёска, дзе ён нарадзіўся, і вуліца ў Гомелі.

**Няжноў Валянцін Сцяпанавіч** (н. 31.5.1915 г. у г. Ленінград) — старшы лейтэнант, камандзір падраздзялення сувязістаў 29-га палка 12-й гвардзейскай стралковай дывізіі. 29.9.1943 г. у ліку першых фарсіраваў Днепр каля в. Глушэц Лоеўскага р-на. Сувязісты



В. С. Няжноў



А. А. Рыжкоў



Р. М. Ціханаў



М. І. Шмаргун

пад яго камандаваннем праклалі тэлефонную лінію і ўстанавілі сувязь з захопленым плацдармам. У ходзе баёў на пераправе некалькі разоў падымаў байцоў у атаку.

Загінуў пры вызваленні Мазыршчыны 24.1.1944 г. Пахаваны ў Мазыры, дзе яго імем названа вуліца.

**Рыжкоў Антон Андрэевіч** (н. 5.3. 1920 г. у Варонежскай вобл.) — ст. лейтэнант, камандзір роты 29-га палка 12-й гвардзейскай стралковай дывізіі. На фронце з першых дзён вайны. Праявіў выключную мужнасць і гераізм пры вызваленні Беларусі восенню 1943 г. Загінуў 28.1.1944 г. Узнагароджаны ордэнам Леніна, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга. Яго імем названа вуліца ў горадзе. Пахаваны на Кургане Славы ў Мазыры.

**Ціханаў Рыгор Мацвеевіч** (н. 10.4.1912 г. у Какчатаўскай вобл.) — лейтэнант, удзельнік савецка-фінляндскай вайны. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны — на фронце, камандзір эскадрона 62-га кавалерыйскага палка 16-й гвардзейскай дывізіі. 28 верасня 1943 г. у раёне в. Ніўкі Брагінскага р-на эскадрон Ціханава пад агнём ворага на падручных сродках пераправіўся цераз Днепр, захапіў плацдарм і ўтрымліваў яго да падыходу асноўных сіл. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Аляксандра Неўскага, Чырвонай Зоркі.

Загінуў 13.2.1944 г. Пахаваны ў Мазыры на Кургане Славы. Яго імем названа вуліца ў горадзе.

**Шмаргун Мікалай Іванавіч** (н. 19.2.1913 г. у Луганскай вобл.) — камандзір разліку супрацьтанкавага ружжа. Вызначыўся 27 верасня 1943 г. пры пераправе цераз Днепр у Брагінскім р-не. У час высадкі на бераг плыт быў разбіты, дэсантнікі на чале са Шмаргуном на падручных сродках дабраліся да берага і закідалі гранатамі варожыя траншэі, што садзейнічала фарсіраванню ракі іншымі падраздзяленнямі.

Памёр ад ран 30.1.1944 г. Пахаваны на Кургане Славы ў Мазыры.

*В. Шур*

### Мазырскія вайсковыя злучэнні і часці

За вызваленне Мазыра ў ходзе Калінкавіцка-Мазырскай аперацыі 1944 г. загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ад 15 студзеня ганаровае найменне «Мазырскіх» атрымалі 18 злучэнняў і часцей 61-й арміі і 16-й паветранай арміі Беларускага фронту:

55-я стралковая дывізія (камандзір — палкоўнік М. М. Заіюльеў),

415-я стралковая дывізія (камандзір — палкоўнік П. І. Машчалкоў),

3-я гвардзейская кавалерыйская дывізія (камандзір — генерал-маёр М. Д. Ягадзін),

4-я гвардзейская кавалерыйская дывізія (камандзір — генерал-маёр Г. І. Панкратаў),

14-я гвардзейская кавалерыйская дывізія (камандзір — палкоўнік Г. П. Коблаў),

17-я гвардзейская кавалерыйская дывізія (камандзір — генерал-маёр П. Т. Курсакоў),

15-я гвардзейская кавалерыйская дывізія (камандзір — генерал-маёр І. Т. Чаленка),

6-я артылерыйская дывізія прарыву (камандзір — генерал-маёр А. С. Біцюцкі),

234-я знішчальна-авіяцыйная дывізія (камандзір — палкоўнік Е. З. Тананашвілі),

145-ты гвардзейскі знішчальны супрацьтанкавы полк (камандзір — палкоўнік С. Ф. Лобыраў),

1816-ты самаходна-артылерыйскі полк (камандзір — падпалкоўнік К. П. Рыжанкоў),

6-ты гвардзейскі мінамётны полк (камандзір — палкоўнік Н. М. Мурзаеў),

7-мы гвардзейскі мінамётны полк (камандзір — маёр Парфір'еў),

79-ты гвардзейскі знішчальна-авіяцыйны полк (камандзір — маёр М. Е. Нядзелька),

519-ы знішчальна-авіяцыйны полк (камандзір — маёр К. М. Мурыга),

810-ты асобны рэактыўны артылерыйскі дывізіён (камандзір — маёр С. Е. Салаўёў),

20-ты асобны агнямётны батальён (камандзір — маёр М. Н. Сакалоў),

344-ты інжынерны батальён (камандзір — капітан Г. В. Дзёмін).

## Смутак і гнеў

Савецкі салдат, уступіўшы на беларускую зямлю, амаль паўсюдна сустракаў жахлівы малюнак: разбураныя і спаленыя гарады і вёскі, абяздоленыя і замардаваныя людзі, шматлікія ахвяры акупацыйнага рэжыму. Ён стаў сведкам фашысцкага генацыду. Сэрца яго перапаўнялі смутак і гнеў. У той жа час савецкі воін станавіўся і першай «надзвычайнай камісіяй», фіксуючы для сваіх сучаснікаў і нашчадкаў па свежых слядах карціну злачынстваў.

Эмацыянальнае ўздзеянне гэтых дакументаў, падчас не зусім умела складзеных, іх сапраўднасць узмацняюцца тым, што побач з подпісам воіна стаяў подпіс непасрэднага відавочцы злачынстваў гітлераўскіх катаў. Савецкі салдат і вызвалены ім жыхар Беларусі пісалі праўду, ні ў чым не пакрывіўшы душой, праўду-вырак, праўду-папярэджанне.

Вось адзін з першых актаў, складзеных у той час.

### АКТ АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ АКУПАНТАЎ У в. ПРУДОК МАЗЫРСКАГА РАЁНА

*13 января 1944 года*

Мы, нижеподписавшиеся жители села Прудок Мозырского района Полесской области Кудрис Кирилл Владимирович, Пугаченко Кондрат Емельянович, Смолянина Полина Кирилловна и представители Политотдела Н-ского соединения гвардии майор Рувинсей В. С., капитан Белкин Р. С., составили настоящий акт на чинимые зверства, грабеж и разрушения в с. с. Прудок, Костюковичи и Казимировка Мозырского района Полесской области немецко-фашистскими оккупантами.

1. В с. Прудок фашистские мерзавцы расстреляли ни в чем невинных 17 граждан села. В числе расстрелянных бывший парторг сельсовета Леонов Карп 32 года, Леонов Григорий 30 лет, бывш. председатель колхоза Мельник Василий 45 лет, колхозник, Пашковская Домна 40 лет, колхозница. Они расстреляли ее только за то, что она напоила водой проходивших партизан. Пашковскую Лидию 18 лет немцы расстреляли за то, что население села не собралось в немецкую комендатуру, и т. д.

Немцы угнали на каторгу в Германию 70 молодых юношей и девушек. За время пребывания в селе гитлеровские мерзавцы ограбили почти всех жителей села. Они забрали 300 голов рогатого скота, 320 свиней, 100 овец, 50 лошадей, птицы более 600 шт. Эти мерзавцы разрушили и спалили много новых колхозных построек: сеновал, конюшню, 2 льносушилки, бойню, коровник и много других.

2. Фашистские палачи полностью спалили с. Костюковичи, т. е. 220 дворов.

Из жителей эти бандиты отобрали 40 семейств, женщин и детей всего 120 чел. и бросили их в колодцы живьем, после чего колодцы забрасывали гранатами. Фашистские поджигатели это сделали только за то, что партизаны убили предателя-старосту. В этом селе бандиты ограбили все население. Забрали 50 лошадей, 80 волов, 150 коров, 150 свиней, 130 овец и много другого колхозного добра и имущества колхозников.

3. Летом 1943 года фашистские каратели ворвались в с. Казимировка, согнали всех жителей в дома и сараи, закрыли и зажгли всех жителей около 600 чел. и более 140 дворов. Отдельные граждане села пытались вырваться из пламени, но мерзавцы их расстреливали и опять бросали в огонь. Все имущество жителей немцы забрали. Такое неслыханное зверство немцы совершили только за то, что подозревали жителей села в поддержке партизанам.

*ЦАМА РФ. Ф. 233. Воп. 2374. Спр. 20. Л. 10—12.*

Падрыхтаваў да друку
*У. Лемяшонак*

### Зеніткі білі трапна

Пасля вызвалення Мазыр яшчэ паўгода заставаўся прыфрантавым горадам. Лінія фронту праходзіла па р. Пціч за некалькі дзесяткаў кіламетраў. Вызваленая ў выніку Калінкавіцка-Мазырскай аперацыі тэрыторыя стала плацдармам для сканцэнтравання сіл 1-га Беларускага фронту пры падрыхтоўцы аперацыі па поўным вызваленні Беларусі.

Па меры набліжэння летняй аперацыі ўсё большым станавіўся паток эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай, якія рухаліся да чыгуначнага вузла Калінкавічы. Станцыі Калінкавічы і Мазыр былі канечнымі пунктамі чыгункі, бліжэйшымі да фронту. Войскі і тэхніка рухаліся таксама па аўтагужавой пераправе цераз Прыпяць. Значэнне чыгуначнага вузла і станцый, пераправы добра разумела германскае камандаванне. Нямецкая авіяцыя вясной і летам 1944 г. бесперапынна бамбіла гэтыя камунікацыі.

27 сакавіка 1944 г. на абарону чыгуначнай станцыі Мазыр, чыгуначнага моста і аўтамагістралі цераз Прыпяць заступіў 546-ты зенітна-артылерыйскі полк малога калібру, якім камандаваў падпалкоўнік Лужанскі. Баявую задачу выконвалі тры дывізіёны пад камандаваннем капітанаў Авяркова і Звягіна, старшага лейтэнанта Куншэнкі. Яны мелі на ўзбраенні малакаліберныя 37-міліметровыя зенітныя гарматы. Значную частку асабовага складу палка складалі дзяўчаты-зенітчыцы. Яны стойка пераносілі ўвесь цяжар вайны, праяўлялі вялікую мужнасць, вытрымку і пільнасць. 5 красавіка 1944 г. быў адбіты першы налёт нямецкіх бамбардзіроўшчыкаў, а хутка збіты і варожы самалёт, далёка не апошні.

У маі, асабліва ў чэрвені налёты сталі больш інтэнсіўнымі. Вельмі цяжкімі былі дні 5 і 6 чэрвеня, калі на чыгуначны мост вораг налятаў тройчы, скінуў не адзін дзесятак авіябомб. Дзякуючы дакладным дзеянням зенітчыкаў мост застаўся непашкоджаным. Пад камандаваннем Звягіна, Кірбяцьева, Барысенкі і Герасімава вызначыліся многія зенітчыкі, у тым ліку Дубіна, Максіменка, Белабародаў, Яжкулава, Мартыненка, Слесарэнка, Дакучай, Валікава і многія іншыя.

На працягу красавіка — мая — чэрвеня 1944 г. полк адбіў 46 налётаў варожай авіяцыі на Мазыр, 58 воінаў-зенітчыкаў былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. Смерцю храбрых загінулі чырвонаармейцы Лысенка, Грыгаран, Голуб, Кулаева, Башкірава.

*Т. Пілiпчук*

## Подзвіг на беларускай зямлі

**Ахметаў Фатула** (н. 19.4.1918 г. у кішлаку Кулангір, Таджыкістан) — ст. сяржант, камандзір разліку супрацьтанкавага ружжа, Герой Савецкага Саюза. На фронце з 1941 г. Вызначыўся пры вызваленні Палескай вобласці. Загінуў 30.7.1944 г. у Польшчы, каля г. Сядлец.

У той дзень 12 лютага 1944 г. вораг усімі сіламі імкнуўся выбіць нашы падраздзяленні з рубяжа перад Прыпяццю. Некалькі атак фашыстаў адбілі воіны часці, у якой служыў старшы сяржант Фатула Ахметаў. Але гітлераўцы пры падтрымцы танкаў зноў пайшлі ў контратаку, імкнучыся прарвацца на ўчастку Перадрэйка — Шастовічы. Артылерыйскага прыкрыцця нашай пяхоты не было, галоўны цяжар адбіцця танкаў лёг на бранябойшчыкаў.

Да пачатку бою Ахметаў са сваім разлікам супрацьтанкавага ружжа выбраў выгадную пазіцыю, выкапаў і замаскіраваў акоп. На іх ішла галаўная варожая машына, якая бесперапынна пасылала з гарматы снарад за снарадам. Ахметаў прыціх у акопе, стараючыся не выдаць сябе. Вось яно, рашаючае імгненне — стрэл, яшчэ адзін — і варожая машына спынілася, паказаўся дымок, потым полымя... Аўтаматчыкі, якія рухаліся ўслед за прыкрыццём яе брані, спыніліся, заляглі, на іх абрушыўся агонь пяхоты. Яшчэ некалькі разоў яны імкнуліся прарвацца да пазіцыі батальёна, але ўсё было дарэмна.

Яго шлях па вогненных дарогах вайны ляжаў далей на захад. Ужо ачышчана ад фашысцкай нечысці ўся беларуская зямля, наперадзе ляжала Польшча. Адзін з баёў каля польскага горада Сядлец стаў апошнім для Фатулы Ахметава. Ён са сваім разлікам захапіў варожы дзот і знішчыў засеўшых у ім гітлераўцаў, што забяспечыла поспех усяму наступаючаму падраздзяленню нашых байцоў. А хутка ён быў смяротна паранены і праз некалькі гадзін памёр. Так салдат і не даведаўся, што за мужнасць і гераізм, праяўленыя пры вызваленні Мазырскага раёна, яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Дзве весткі — адна сумная, другая радасная — пайшлі ў далёкі кішлак Кулангір амаль адначасова...

*Н. Салаўёў*

## Праз дваццаць гадоў

### З успамінаў А. М. Міцуры

У снежні 1943 г. наш партызанскі атрад быў уключаны ў склад 415-й стралковай дывізіі. Мяне залічылі ў 1326-ты полк радавым і прызначылі першым нумарам кулямёта.

12 студзеня 1944 г. наша падраздзяленне атрымала задачу наступаць у напрамку Мазыра. Ішлі па лесе. 13 студзеня раніцай занялі пазіцыю ў раёне вёсак Раеўскія — Пянькі — Булаўкі. Хутка пачаўся бой. Вораг адчайна супраціўляўся, мы рухаліся наперад павольна, з вялікай цяжкасцю. Агонь праціўніка не даваў падняцца. Я з кулямётам знаходзіўся на правым флангу падраздзялення, паміж вёскамі Раеўскія — Булаўкі. Камандзір загадаў: «Міцура, правы фланг адкрыты. Агонь туды!» Удалечыні быў бачны горад, увесь у полымі пажараў і дыме.

У 23.40 13 студзеня я са сваім узводам увайшоў у Мазыр. Плошча была запоўнена нашымі салдатамі. На даху трохпавярховага дома яшчэ вісеў нямецкі сцяг. Было светла, гарэлі дамы. Удалечыні гарэў і драўляны мост цераз Прыпяць. Адзін з камандзіраў загадаў зняць варожы сцяг. І раптам прагрымеў выбух, трохпавярховага дома як не было. Перад адступленнем фашысцкія вылюдкі замініравалі яго. Каля 30 байцоў было паранена і забіта.

Немцы адступілі ў бок Пхова і працягвалі абстрэльваць горад з гармат, які быў густа замініраваны. Падраздзяленні рухаліся па вуліцы Пралетарскай след у след, каб не падарвацца. Ноччу прыбылі ў вёску Прудок. Разведка данесла, што немцы ў Мерабелі, Загорынах і Касцюковічах.

14 студзеня 1944 г. у 5 гадзін раніцы спыніліся на ўскрайку лесу перад вёскай Касцюковічы, акапаліся. Капаць было вельмі цяжка, акопы адразу напаўняліся вадой. Атрымалі боепрыпасы, падрыхтаваліся да бою. Патроны нам выдавалі трасіруючыя, немцы добра бачылі, адкуль я вяду агонь. Выбух... Мяне параніла. Трацячы прытомнасць, убачыў над сабою твар камандзіра: «Міцура, ты будзеш жыць! Я прадстаўлю цябе да ўзнагароды».

Узнагарода — ордэн Славы III ступені знайшла мяне толькі ў 1964 г., роўна праз дваццаць гадоў.

## Усходы на папялішчы

Страшэнны малюнак разбурэнняў пакінуў вораг у Мазыры і раёне пасля 29 месяцаў акупацыі. У горадзе фашысты разбурылі мноства будынкаў. Адступаючы, яны знішчылі ўсе прамысловыя прадпрыемствы: заводы «Чырвоны Кастрычнік», «Пралетарый», «Пхоў», піўзавод, мясакамбінат, хлебазавод, старую і новую электрастанцыі, прадпрыемствы мясцовай прамысловасці і прамкааперацыі, усе культурныя і лячэбныя ўстановы. З 11 школ фашысты разбурылі 9, знішчылі дзве багатыя бібліятэкі. На дзень вызвалення ў Мазыры засталося толькі 4,7 тыс. жыхароў.

На тэрыторыі Мазырскага раёна гітлераўцы поўнасцю знішчылі машынна-трактарныя станцыі, грамадскія пабудовы калгасаў і саўгасаў, а таксама амаль усе клубы, школы і бальніцы. З 93 вёсак 36 былі спалены амаль поўнасцю і 10 на 50—75 працэнтаў. Толькі на тэрыторыі Скрыгалаўскага сельсавета было разбурана больш як 800 жылых пабудоў, а па Мазырскім раёне — 2668 (у межах да 1956 г.).

У жыхароў Казіміраўскага, Скрыгалаўскага і Слабадскога сельсаветаў гітлераўцы адабралі 1897 кароў, 339 коней, 1545 свіней, 3146 авечак. Такое ж рабаванне насельніцтва праводзілася і ў іншых сельсаветах.

З першых дзён вызвалення ў асноўным з былых партызан і падпольшчыкаў былі сфарміраваны кіруючыя партыйныя і камсамольскія органы, адноўлены мясцовыя Саветы, сталі функцыяніраваць грамадскія арганізацыі. Усе намаганні былі накіраваны на ўсебаковую дапамогу фронту і аднаўленне разбуранай акупантамі народнай гаспадаркі.

У першую чаргу была адноўлена работа чыгункі. У Мазыры была пушчана піларама, наладжана вытворчасць сельскагаспадарчага інвентару і прадметаў хатняга ўжытку.

Праз два тыдні пасля вызвалення Мазыра ў горадзе была адноўлена гарадская электрастанцыя. Яшчэ раней аднавіў работу хлебазавод. Праз 20 дзён пачаў працаваць водаправод. Хутка была адноўлена і фабрыка індывідуальнага пашыву, якая да 1 студзеня 1945 г. дала прадукцыі больш чым на мільён рублёў у тагачасных цэнах. 23 студзеня




Руіны будынка Палескага абкама партыі. 1944



Дэлегацыя з Ульянаўска. 1944

1944 года рабочыя прамысловай арцелі «Молат» прыступілі да выканання важнага задання: у тэрміновым парадку трэба было даць насельніцтву Мазыра і раёна 900 вёдзер і 400 леек.

Дзякуючы самаадданай працы ў Мазыры была адбудавана мэблевая фабрыка «Прафінтэрн», закончана аднаўленне Пхоўскага лесазавода.

Значную дапамогу жыхарам Мазыра і Мазырскага раёна ў аднаўленчых работах аказвалі воіны 61-й арміі. Яны аднаўлялі дамы, ачышчалі зямлю ад мін. У паходных кузнях двух кавалерыйскіх карпусоў рамантавалі сельскагаспадарчы інвентар. Частка выбракаваных армейскіх коней была перададзена калгасам і саўгасам. У сваю чаргу мясцовыя жыхары аказвалі дапамогу воінам у аднаўленні дарог і мастоў.

Аднаўляць народную гаспадарку вызваленых раёнаў дапамагала ўся краіна. У маі 1944 г. Ульянаўская вобласць РСФСР узяла шэфства над Палескай вобласцю. Калектывы прадпрыемстваў Ульянаўска прыслалі ў Мазыр прамысловае абсталяванне, пісьмовыя прылады, наглядныя дапаможнікі і неабходнае абсталяванне для школы, інвентар для дзіцячых садкоў. На работу ў Мазыр былі прысланы настаўнікі.

Для вызначэння аб'ёму дапамогі ў Мазыр прыехала дэлегацыя з Ульянаўскай вобласці. Члены дэлегацыі пабывалі ў сёлах, з душэўным пачуццём рэагавалі на мясцовыя патрэбы. У хуткім часе ў раён сталі паступаць трактары і запасныя часткі. З Ульянаўскай вобласці прыязджалі інжынеры і тэхнікі, якія дапамагалі рыхтаваць механізатарскія кадры. Першымі трактарыстамі часта станавіліся жанчыны, таму што мужчыны былі на фронце. Трактароў яшчэ не хапала, і на веснавой сяўбе 1944 г. шмат дзе выкарыстоўвалі коней, валоў і нават кароў.

Працоўныя раёна аказвалі дзейсную дапамогу савецкім войскам, якія наносілі знішчальныя ўдары па ворагу. У лютым 1944 г. па пачыну калгаснікаў калгаса імя Варашылава пачаўся збор грошай на эскадрыллю баявых самалётаў «Палескі партызан». У сакавіку — красавіку было сабрана і ўнесена ў фонд Савецкай Арміі 475 тыс. руб. і 35,9 тыс. руб. аблігацыямі дзяржаўных пазык. Калектыў рабочых і служачых мазырскай прамысловай арцелі «Молат» на агульным сходзе 25 сакавіка 1944 г. уключыўся ў перадмайскае спаборніцтва, каб сваёй ударнай працай дапамагчы Чырвонай Арміі разграміць ворага. Калектыў абавязаўся выканаць красавіцкі план на 155, а гадавы на 140 працэнтаў, павысіць прадуктыўнасць працы на 15 працэнтаў.

Прадпрыемствы, калгасы і арганізацыі шэфствавалі над ваеннымі шпіталямі. Шэфы збіралі для параненых воінаў прадукты і паліва. Актывісты Чырвонага Крыжа, у асноўным жанчыны, дзяжурылі ля ложкаў цяжкапараненых і хворых воінаў, рамантавалі і мылі бялізну, праводзілі з раненымі воінамі гутаркі, чыталі газеты. Сіламі абласнога тэатра, ансамбля песні і танца ў шпіталях даваліся канцэрты.

У Мазыры мясцовыя актывісты арганізоўвалі сустрэчы прыбыўшых параненых на вакзалах, аказвалі садзейнічанне ў іх перавозцы ў шпіталі, падтрыманні дабрабыту і парадку ў палатах, мыцці і рамонце бялізны. Ля ложкаў параненых у асноўным дзяжурылі жанчыны.

На працягу 1944 г. насельніцтва Мазыра адпрацавала на нядзельніках па

аднаўленні роднага горада 31 тысячу 825 чалавека-дзён.

Праз два тыдні пасля вызвалення Мазыра пачаліся заняткі ў чатырох пачатковых і дзвюх сямігадовых школах. Пачаў працаваць дзіцячы дом, у якім выхоўвалі 150 сірот. Адноўлена было педагагічнае вучылішча. А ў лютым 1944 г. урад Беларусі прыняў пастанову аб адкрыцці ў Мазыры настаўніцкага інстытута. У пачатку красавіка там пачаліся заняткі.

Аднаўляючы разбураную ворагам народную гаспадарку, працоўныя Мазыра і раёна да канца вайны аказвалі рознабаковую дапамогу фронту. Яны ўнеслі свой уклад у справу дасягнення канчатковай перамогі над гітлераўскай Германіяй. Пасля перамогі ўся ўвага і намаганні насельніцтва былі накіраваны на аднаўленне і далейшае развіццё народнай гаспадаркі. І яно ішло хуткімі тэмпамі.

*А. Васько*

## Савецкая ўлада вяртаецца

Увесь студзень 1944 года ішлі ўпартыя баі за вызваленне Мазыршчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Да канца чэрвеня Асавецкі і Скрыгалаўскі сельскія Саветы знаходзіліся на лініі фронту, якая праходзіла за 35—40 кіламетраў ад Мазыра па рацэ Прыпяць. Гэта перашкаджала аднаўленню народнай гаспадаркі пастаяннымі налётамі варожай авіяцыі, высокай сканцэнтраванасцю войск у прыфрантавой паласе. Амаль тры тысячы мужчын, якія ў ваенныя гады жылі ў вёсках, разам з часткаю партызан брыгады імя Аляксандра Неўскага былі мабілізаваны ў Чырвоную Армію.

З ліку моладзі дапрызыўнага ўзросту і былых воінаў, дэмабілізаваных па раненні, ваенкаматамі і арганізацыямі ДТСААФ былі сфарміраваны ваенізаваныя атрады па размініраванні вызваленай тэрыторыі раёна і брыгады па будаўніцтве прымітыўных грамадскіх пабудоў і жылля для сем'яў загінуўшых на фронце.

На працягу студзеня 1944 года ў Мазыры і ў Мазырскім раёне распачалі дзейнасць усе Саветы, ад абласнога да сельскіх, а да вясны ва ўсіх населеных пунктах былі адноўлены калгасы, сістэма сувязі, установы народнай асветы, гандлю і іншыя службы.

Аб актыўнай, напружанай рабоце органаў Савецкай улады на вызваленай ад ворага Мазыршчыне сведчаць архіўныя дакументы, што прыводзяцца ніжэй.

### ПАСТАНОВА ПАЛЕСКАГА АБЛСАВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

г. Мазыр *21 студзеня 1944 г.*

Об открытии питательных пунктов для возвратившихся граждан из тыла противника.

Исполком областного Совета депутатов трудящихся постановляет:

1. Открыть два питательных пункта: первый — питательный пункт при Калинковичском горторге; второй — при горторге г. Мозыря для питания граждан, возвратившихся из тыла противника. Отпустить по одной тонне зерна, по центнеру крупы и по одной тонне картофеля для общего питания.

2. Норму хлеба установить по 200 грамм на одного человека на обед и ужин.

...5. Отпуск обедов и ужинов производить по списку, проверяя документы.

Председатель исполкома облсовета *В. Леденев*

*Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 172. Воп. 2. Спр. 1. Л. 1.*